# ДЗВЕ МУЗЫ КАРАЛЯ

**Карэспандэнт «Звязды» ў Літве пазнаёміўся з каралём керамікі, даведаўся, як самабытнасць супрацьстаіць глабалізацыі, і літаральна пад нагамі знайшоў... СССР.**

## НА СВАЕ РУКІ

Вітаўтас Валюшыс лічыцца адным з лепшых керамістаў Еўрапейскага саюза, што пацвярджае ўзнагарода «Залаты вянок» і тытул караля керамікі. У яго багатай калекцыі ёсць і беларуская кераміка. Вітаўтас перакананы, што музей, які ён стварыў паблізу літоўскага горада Уцена (літ. Utena) не мае аналагаў у свеце. Цяпер у ім каля 20 тысяч экспанатаў.

Музей керамікі пана Вітаўтаса, рамесніка з больш чым 40-гадовым стажам, знаходзіцца ў двухпавярховым будынку, узведзеным да Другой сусветнай вайны, потым там змяшчалася школа. Ганчар самастойна адрамантаваў будынак. Яго прыватная ініцыятыва па стварэнні ўнікальнага ганчарнага цэнтра была падтрымана ў рамках трансгранічнага праекта Еўрапейскага саюза «Музейныя вароты».

— На жаль, глабалізацыя нясе пагрозу страты нацыянальных традыцый. У Еўропе, ды і не толькі, цяпер маюцца нядобрыя тэндэнцыі: рамеснікі капіруюць адзін аднаго, робяць тое, што не ўмеюць, не адчуваюць. А трэба ствараць тое, што адчуваеш, важна не забываць свае карані, — лічыць майстра.

Ён не толькі з задавальненнем паказвае калекцыю шматлікім гасцям, але і саджае ахвотных за ганчарнае кола і дазваляе на свае рукі адчуць цуд ператварэння кавалка гліны ў непаўторную рэч.

— Я ў дзяцінстве быў маленькага росту, а мой лепшы сябар — высокі прыгажун. Дык у яго ўсе дзяўчаты былі закаханыя, а мне трэба было займацца самба, пісаць вершы, музыку, добра танчыць, каб не адставаць, — смяецца Вітаўтас. — А потым заняўся керамікай. Цяпер у мяне дзве Музы: жанчына і гліна.



Самы вядомы ў Літве кераміст Вітаўтас ВАЛЮШЫС.

## ЛІТОЎСКІ КРАЙ АЗЁР

Літоўскі горад Уцена, дзе жыве каля 28 тысяч чалавек, мала вядомы беларусам. Знаходзіцца ён на адлегласці прыкладна 100 кіламетраў ад Вільнюса. На гербе горада — выява падковы.

Гэта адзін са старэйшых літоўскіх гарадоў, у летапісе згадваецца ў 1261 годзе. Назву атрымаў ад рэчкі Уценайтэ. Славутасць горада — самы стары ў Літве нацыянальны парк з лясамі і азёрамі, аўтэнтычнымі вёсачкамі. Дарэчы, ва Уценскім павеце каля 190 азёр.

Самы стары будынак гарадка — паштовая станцыя. Яна ўзведзена ў 1835 годзе, а яе адкрыццё адбылося з удзелам расійскага імператара Мікалая I і яго сына Аляксандра. У наш час там знаходзіцца экспазіцыя філіяла музея, якая расказвае пра дэпартацыю літоўцаў.

Дарэчы, з расійскім царом звязана гісторыя пра скаргу на мясцовага памешчыка Краўзэ. Апошні быў вельмі жорсткім чалавекам, здзекаваўся з прыгонных сялян, біў іх. Перад тым, як імператар прыехаў ва Уцену, салдату, які павінен быў стаяць на варце, даверылі перадаць скаргу. Той паклаў паперу ў форменную шапку. Так сталася, што Мікалай I выпадкова спыніўся менавіта каля гэтага салдата. Апошні ўпаў на калені і зняў шапку. Цар узяў скаргу і адрасу прачытаў. Жорсткага памешчыка сваім распараджэннем выселілі...

Керамікі шмат і на вуліцах Уцены, і ў мясцовым краязнаўчым музеі. У апошнім ёсць таксама і багатая калекцыя твораў майстроў разьбы па дрэве XVII—XIX стагоддзяў.

Праект «Музейныя вароты» вылучыў Уценскаму краязнаўчаму музею 70 тысяч еўра для афармлення залы, прысвечанай гісторыі горада. Дзякуючы гэтым грашам, тут з'явіўся інтэрактыўны «электронны стол», які дазваляе ўбачыць, як мяняўся горад: якія тут з'яўляліся і зніклі дамы, як перабудоўваліся касцёлы, якія працавалі прамысловыя прадпрыемствы...

Сярод 85 тысяч экспанатаў ёсць і прысвечаныя савецкаму часу. Напрыклад, плакаты-«справаздачы» пра тое, як паляпшаўся ўзровень жыцця, «тыповы» прадуктовы набор...

Цяпер тут мала што нагадвае савецкае мінулае. На вуліцах не ўбачыш помнікаў Леніну, не засталося тагачасных назваў вуліц. Але нечакана я ўбачыў проста пад нагамі... крышку ад люка, зробленую ў Літоўскай ССР...

Пра тое, як калісьці выглядалі літоўскія хутары, можна атрымаць уяўленне ў этнаграфічнай сядзібе братоў Мішкіняй.



У музеі керамікі пад Уценай кожны можа адчуць сябе каралём.

## НА ПАЛЯХ ПРЭС-ТУРА...

Перад паездкай у Літву музейныя супрацоўніцы запыталі, што мне было б цікава ўбачыць. Цытуючы словы героя фільма «Дэжа вю», я пажартаваў: «бокс, секс, джаз». Але ў адказ пачуў сур'ёзнае, што апошняга з пералічанага больш няма. Аказалася, што мясцовы музычны гурт забаронены за радыкалізм... Затое ва Уцене ёсць музычны фантан на маляўнічым возеры Даўнішкіс.

Не знайшоў я тут і марак (мой сын збірае) на мясцовай пошце, куды адвёў мяне літоўскі калега. Літоўскія еўраскептыкі скардзіліся на тое, што няма больш нацыянальных банкаў, а вытворцам сельскагаспадарчай прадукцыі плацяць, каб... не аралі і не сеялі. Шмат моладзі пакідае краіну ў пошуках лепшай долі ў больш багатых краінах ЕС.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Уцена—Полацк—Віцебск.*

---

■ Святло ў акне

# ЛЮБОЎ ЖЫВЕ ВЕЧНА, калі людзі цікавыя адно аднаму

**Таццяна Іёнаўна Пятрова і Мікалай Пятровіч Шаліма — прыгожая сямейная пара, якая 6 жніўня зладзіць «залатое» вяселле. Як пабудаваць паспяховую кар'еру, стварыць шчаслівую сям'ю і пажылы век успрымаць як падарунак лёсу — пра гэта наша гутарка.**

***— Расказваюць, што гісторыя вашага знаёмства вельмі незвычайная...***

**Мікалай Пятровіч (М.П.)** — Гэта быў 1965 год. Я вучыўся на юрфаку БДУ і ў першы дзень заняткаў пасля канікул убачыў у холе насценгазету — мяне прыцягнула фатаграфія дзяўчыны, якая забаўлялася ў стропах парашута. Кажу аднакурснікам: «Якая цікавая дзяўчына, хачу пазнаёміцца». Праз два дні я прыйшоў да яе на кватэру.

**Таццяна Іёнаўна (Т.І.)** — Я вучылася на журфаку, і ў мяне было заданне: зрабіць інтэрв'ю з парашутыстамі. Вырашыла не абмяжоўвацца гутаркай, а скокнуць, каб зразумець стан сваіх герояў. Прызнаюся, баялася, але скокнула. А потым, вядома, выпусціла насценгазету, а ў ёй — сяброўскі шарж. А далей было так: у мяне дома разам з сяброўкай рыхтаваліся да палітэканоміі. Прыйшоў малады чалавек і вельмі добра патлумачыў нам тэму. Потым сяброўка Ніна кажа мне: «Добры хлопец, трэба браць».

***— Таццяна Іёнаўна, многія памятаюць праграму на беларускім радыё «Рамантыкі». А яшчэ вы вялі клуб «Рэпарцёр», з якога выйшлі цяперашнія зоркі журналістыкі Ягор Хрусталёў, Алесь Круглякоў, Аляксандр Хабараў. Самая ж знакамітая ваша праграма — маральна-прававы канал па праблемах дзяцей і падлеткаў «Прэзумпцыя». Калі вы яе стварылі, Мікалай Пятровіч працаваў пракурорам Ленінскага раёна Мінска. Кажуць, што не без дапамогі мужа з'явілася такая перадача.***

**Т.І.** — Ужо не адзін дзясятак гадоў апраўдваюся: удзел Колі тут мінімальны. Вядома, калі рыхтавала першыя выпускі, то раілася з ім па юрыдычных пытаннях. Раз, два ён мог дапамагчы мне запрасіць эксперта, нешта падказаць, але не ўвесь жа час... Хоць на радыё і быў такі пасыл, маўляў, у цябе муж юрыст, вось і будзеш рабіць. Аналагаў гэтай перадачы не было ва ўсім Савецкім Саюзе.

«Прэзумпцыя» стваралася ў час перабудовы, калі ўжо было можна ўздымаць вострыя тэмы. Але ніякіх пастановачных спраў — толькі рэальныя дзіцячыя лёсы. Я заўсёды выступала ў ролі адваката: самае «цяжкае» дзіця было пад маёй абаронай. Тады і цяпер перакanana: у дзіцячых бедах вінаваты бацькі, грамадства.

***— Праца журналіста і пракурора — гэта ненармаваны працоўны дзень. Хто вам дапамагаў выхоўваць сына?***

**М.П.** — Самі спраўляліся. Бывала, Таня ў камандзіроўцы, я адвяду Сяргейку ў садок, а забіралі яго суседзі. Калі я на здарэнні, то прыязджаў дадому часам і пад раніцу. Інакш маглі выклікаць. Мы лічылі гэта нормай нашага жыцця.

**Т.І.** — Калі Сяргейка стаў школьнікам, брала яго ў камандзіроўкі, асабліва калі яны планаваліся ў рэгіён з гістарычна-архітэктурнымі славутасцямі. Ён тусаваўся разам з дзецьмі з клуба «Рэпарцёр». Калі маленькі Сярожа прыдумляў казкі, то падпісваўся — пісьменнік С. Шаліма. Была ўпэўнена, што сын пойдзе вучыцца на журфак.

**М.П.** — Сын вучыўся ў 9 класе, і я спытаў: «Сярожа, ты вызначыўся з прафесіяй?» Ён адказвае, маўляў, ты мне падкажы. «Не, вырашай сам, каб потым не ўпікаў мяне», — так я адказаў. Сярожа выбраў юрфак, а потым адвакацкі шлях. Да таго часу і я ўжо быў старшынёй Мінскай абласной калегіі адвакатаў...

***— Таццяна Іёнаўна, калі дазволіце, спытаю пра здароўе, ведаю ад агульных знаёмых, што вы перанеслі некалькі аперацый і адну з іх на сэрцы...***

**Т.І.** — Так, па аперацыях я выканала і перавыканала план. Цяпер лячуся спевамі. Чатыры гады назад пачала браць урокі ігры на гітары і ўжо выступаю з невялікімі хатнімі канцэртамі для сяброў. І яшчэ мяне выдатна лечыць біятлон — я фанатка гэтага віду спорту. Нават з лякарні прасіла выпісаць датэрмінова, каб глядзець трансляцыі са спаборніцтваў.

***— А па працы не сумуеце?***

**Т.І.** — Ёсць крыху. Мяне і запрашалі: голас жа не пастарэў. Але, па-першае, у мяне непрацоўная група інваліднасці. Па-другое, на пенсіі беспрацоўнай сябе не адчуваю! Гэта пакуль ты ходзіш на работу, ёсць адгаворка — няма калі. А цяпер: спевы, кнігі, біятлон, лецішча, сустрэчы з сябрамі, хатнія справы. Гэта ж вялікі падарунак лёсу, што ў мяне ёсць на гэта час. Мы ўсе заядлыя грыбнікі, а ўнучка Света — проста чэмпіён! На лецішчы працуем без фанатызму: не магу сёння, значыць, дапалю градку заўтра. Прыязджаем толькі на выхадныя. Галоўнае прызначэнне лецішча — збіраць сяброў. Раней мы шмат падарожнічалі па Еўропе, цяпер асцерагаюся далёка з'язджаць. А па Беларусі на экскурсіі ездзім часта.

**М.П.** — Рады, што па-ранейшаму запатрабаваны як спецыяліст. Ганаруся, што цяпер, калі кажуць «адвакат Шаліма», людзі пытаюць: «Які: малодшы ці старэйшы?»

***— Мікалай Пятровіч, вы заўсёды займаліся грамадскай дзейнасцю. На працягу 29 гадоў былі членам прэзідыума Мінскага абкама прафсаюзаў работнікаў дзяржорганаў, ваша імя занесена ў Кнігу Пашаны Рэспубліканскага прафсаюза работнікаў дзяржустаноў, вялі сатырычна-прававую рубрыку ў часопісе «Вожык», з'яўляецеся сузаснавальнікам мінскага «Ротары клуба», а цяпер і ў Мінскім сходзе нашчадкаў шляхты і дваранства сузаснавальнік і другая асоба. Вось пра дваранскія карані хацелася б падрабязней даведацца.***

**М.П.** — Гэта выпадковасць. Неяк Таццяна так сябе паводзіла, што я ў гутарцы сказаў: «Ну, ты і пані». Жонка на поўным сур'ёзе: «Так. Мама казала, што ў нас дваранская карані». Мне, зразумела, захацелася праверыць. Балазе, ужо прыйшоў той час, калі дваранскае паходжанне хаваць не было патрэбы. Распытаў у Тані прозвішчы продкаў і папрасіў свайго добрага знаёмага Ігара Чакалава-Шыдлоўскага праясніць гэта пытанне. Неўзабаве ён мне паведаміў, што Таніна мама з дваранскага роду. «Па маці ты — дваранка, а па тату — дварняк», — пажартаваў я тады. І падумаў: раптам памыляюся. Ізноў на дапамогу прыйшоў Ігар, і высветлілася, што з «дварняком» я паспяшаўся: мама і тата Таццяны з дваранскіх родаў Усевялікага Войска Данскога. Вырашыў, пара і пра сябе даведацца. Аказалася, што па матчынай лініі я належу да рыцарскага роду, вядомага з XIV стагоддзя. У 2009 годзе мы зарэгістравалі грамадскую арганізацыю Мінскі сход нашчадкаў шляхты і дваранства.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Вы такія розныя па характары, тэмпераменце, і ўжо паўстагоддзя разам. У чым сакрэт сямейнага шчасця?***

**Т.І.** — У нестарэючым каханні! У мяне эмоцый — цераз край. Нават часам дзіўлюся: як родныя мяне трываюць? Мікалай — такі вогнетушыцель у сям'і. І ўсё ж разам мы шчаслівыя.

**М.П.** — Не верце, калі кажуць, маўляў, каханне жыве тры гады. Яно можа жыць і 30, і 50 гадоў, калі людзі цікавыя адзін аднаму. Я часам жартую: калі буду другі раз жаніцца, то толькі на глуханямой, але як толькі Таня легла ўбальніцу, дык я бег ад цішыні, якая акружыла мяне...

**Т.І.** — У рэанімацыі мне было вельмі дрэнна, у медыкаў гэта завецца «мы страчваем пацыента», але як толькі Мікалай з'явіўся на парозе, усе гэтыя прыборчыкі, да якіх мяне падключылі, у той жа момант пачалі паказваць добрую дынаміку.

**Гутарыла Аксана ЯНОЎСКАЯ** ■